Упраўленне адукацыі Гродзенскага выканкама
Аддзел адукацыі Зэльвенскага райвыканкама
ДУА “Каралінская сярэдняя школа”

# Разнастайныя формы і метады работы з тэкстам -умова фарміравання навыка чытання

Каралін
2012

Рэкамендавана метадычным саветам
Каралінскай сярэдняй школы

Рэцэнзент: Шэйка В.І., намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Каралінскай СШ

**Разнастайныя формы і метады работы з тэкстам - умова фарміравання навыка чытання.** Складальнік: Ганчар Т.М. – Каралін: - Установа адукацыі “Каралінская сярэдняя школа”, 2012, 40 с.

У зборніку прадстаўлены матэрыялы з вопыту работы Ганчар Т. М, настаўніцы пачатковых класаў .

## Уводзіны

Значэнне кнігі ў жыцці чалавека цяжка пераацаніць. У век камп’ютараў і высокіх тэхналогій чалавек усё роўна не можа абысціся без чытання. Яно з’яўляецца крыніцай атрымання не толькі інфармацыі, але і задавальнення.

Педагогі і псіхолагі падцвярджаюць, што дзеці, якія навучыліся чытаць у пачатковай школе, павінны і далей развіваць гэты навык, але ужо да 7-8 класаў яны чытаюць усё горш і горш. Маруднасць у чытанні, адсутнасць цікавасці да яго прыводзіць да таго, што інтэлектуальная дзейнасць таксама замаруджваецца. Дзеці, якія павольна прачытваюць умову задачы, практыкавання,  забываюць яго сэнс перш, чым пачнуць выконваць. Па прычыне беднага лексічнага запасу многія тэрміны і паняцці ім проста незразумелыя.

**Чытанне – важнейшы сродак пазнання**

У літаратурным чытанні неабходна ўмоўна адрозніваць два перыяды: падрыхтоўчы і асноўны. Другі год навучання нельга аднесці да асноўнага перыяду, паколькі ў другакласнікаў не сфарміраваны навык чытання па-беларуску. У другім класе акцэнтуецца ўвага на развіццё навыку чытання па-беларуску, узбагачэнне і пашырэнне слоўніка вучняў, авалоданне арфаэпічнымі і акцэнталагічнымі нормамі беларускай мовы, фарміраванне маўленчай дзейнасці на беларускай мове. У трэцім і чацвёртым класах (асноўны перыяд) галоўным становіцца мастацкі твор, яго мастацкія асаблівасці, чытацкая культура школьніка.

Структура прадмета ”Літаратурнае чытанне“ характарызуецца наяўнасцю ўрокаў класнага і пазакласнага чытання. Пазакласнае чытанне з’яўляецца састаўной часткай вучэбнага прадмета ”Літаратурнае чытанне“. Мэта пазакласнага чытання – пашырэнне чытацкага кругагляду вучняў, фарміраванне чытацкай самастойнасці, прывіццё цікавасці да чытання кніг, часопісаў, газет, выхаванне актыўных чытачоў. На ўроках пазакласнага чытання дзеці атрымліваюць веды аб элементах кнігі: вокладцы, пераплёце, тытульным лісце, форзацы, змесце, прадмове, пасляслоўі, ілюстрацыі; пачатковае ўяўленне аб каталагу, рэкамендацыйных указальніках для чытання; уяўленні аб перыёдыцы (дзіцячых газетах і часопісах).

Аб’ектам вывучэння прадмета ”Літаратурнае чытанне“ з’яўляюцца перш за ўсё мастацкія творы беларускай дзіцячай літаратуры, а таксама творы класічнай літаратуры, якія ўвайшлі ў кола дзіцячага чытання. Прыярытэт

аддаецца беларускай літаратуры. Разам з мастацкімі творамі з розных абласцей літаратурнай творчасці (фальклор, класіка, сучасная і замежная дзіцячая літаратура) у праграму ўключаецца для вывучэння навукова-мастацкія і навукова-пазнавальныя тэксты.

У адпаведнасці з узроставымі магчымасцямі вучні атрымліваюць элементарныя веды з вобласці літаратуразнаўства на практычным узроўні, або ўзроўні ўяўленняў, якія неабходныя для засваення літаратуры як мастацтва слова і якія з'яўляюцца сродкам рашэння творчых задач, а таксама абслугоўваюць самастойную творчую працу маленькіх чытачоў.

Малодшыя школьнікі практычна засвойваюць значэнні такіх слоў, як ”аўтар (пісьменнік, паэт)“, ”тэма“, ”галоўная думка“, ”падзея, сувязь падзей“, ”кампазіцыя“, ”герой (дзеючая асоба, персанаж)“, ”учынак“, ”характарыстыка героя“, ”мастацкае (вобразнае) слова“, ”пейзаж“ (карціна прыроды), ”гукапіс“, ”рыфма“, ”рытм“, ”жанр“, ”казка“, ”быліна“, ”легенда“, ”апавяданне“, ”верш“, ”байка“.

У вучняў фарміруюцца на практычным узроўні ўяўленні аб асаблівасцях розных жанраў: прыказкі, скорагаворкі, загадкі, пацешкі, небыліцы, народныя песні, казкі, апавяданні, быліны, легенды, вершаванага твора; аб мастацкім і навукова-пазнавальным творы.

Яны засвойваюць традыцыйную тэматыку твораў і кніг для дзяцей (аб Радзіме, яе героях, розных людзях: дзецях і дарослых, працавітых і лянівых і інш., жывёлах і раслінах, машынах і рэчах, прыгодах і фантастыцы).

Назапашваюць веды аб аўтарах, з творчасцю якіх пазнаёміліся на ўроках класнага і пазакласнага чытання (пісьменнік – паэт або празаік, на якія тэмы піша).

Назіраюць за вобразнымі словамі і выразамі літаратурнага твора, практычна засвойваюць вобразна-выяўленчыя сродкі мовы мастацкага твора (эпітэт, параўнанне, метафара, адухаўленне, эмацыянально-ацэначныя словы).

Атрымліваюць веды аб сродках выразнага чытання мастацкага твора (сіла голасу, тон, тэмп, паўза, лагічны націск).

Звесткі з біяграфіі і творчасці класікаў дзіцячай літаратуры даюцца як аснова для фарміравання сувязяў: ”аўтар – творы“, ”аўтар – тэмы твораў і кніг“, ”аўтар – жанры“.

Малодшыя школьнікі набываюць веды аб элементах кнігі (вокладка, тытульны ліст, прадмова, пасляслоўе, змест, ілюстрацыя, анатацыя), аб сродках арыентацыі ў свеце кніг (каталог, рэкамендацыйныя ўказальнікі, кніжная выстаўка), атрымліваюць уяўленні аб газеце, часопісе як перыядычных выданнях; веды аб культуры і гігіене чытання.

Малодшыя школьнікі авалодваюць агульнавучэбнымі, маўленчымі і чытацкімі ўменнямі. Яны вучацца:

- чытаць правільна, асэнсавана і бегла цэлымі словамі ўголас і сам сабе ў адпаведнасці з арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускай мовы;
- чытаць выразна ўголас мастацкія творы розных жанраў, карыстаючыся сродкамі інтанацыйнай выразнасці (тон, тэмп, паўза, лагічны націск);
- ацэньваць сваё і пачутае чытанне ў адпаведнасці з правільнасцю і выразнасцю;
- эмацыянальна ўспрымаць і рэагаваць на пачутае/прачытанае;

прагназаваць змест твора па загалоўку, ілюстрацыях і апорных словах;

- вылучаць незразумелыя словы і выразы, высвятляць іх значэнне праз кантэкст, з дапамогай тлумачальнага і перакладнога слоўніка;
- вылучаць словы, падобныя па гучанні словам рускай мовы, і ўстанаўліваць іх значэнне;
- выяўляць сэнсавыя сувязі паміж падзеямі ў творы (паслядоўныя, часавыя, прасторавыя, прычынныя);
вылучаць галоўныя і другарадныя дзеючыя асобы, аналізаваць іх узаемаадносіны, учынкі, матывы ўчынкаў;
- выяўляць эмацыянальны стан дзеючых асоб, характарызаваць герояў па іх паводзінах, учынках, параўноўваць персанажы.
- знаходзіць у тэксце апісанні дзеючых асоб, карцін прыроды, вызначаць іх ролю ў тэксце;
- узнаўляць мастацкія вобразы (слоўнае маляванне дзеючай асобы, карцін прыроды);
- выяўляць адносіны аўтара да героя, яго ўчынкаў;
- выказваць уласныя адносіны да дзеючых асоб, іх учынкаў, зместу твора.
- вызначаць тэму і галоўную думку твора;
- назіраць за формай апавядання: ад чыйго імя вядзецца апавяданне;
- вылучаць кампазіцыйныя часткі твора: пачатак падзей, вяршыню, самы напружаны момант, завяршэнне падзей;
- дзяліць твор на часткі, складаць план невялікага апавядальнага твора;
- назіраць за будовай верша (вершаваны радок, рытм і рыфма, вобразная мова), знаходзіць у вершы рыфму;
- вызначаць агульны эмацыянальны настрой паэтычнага твора;
- назіраць за выразнымі словамі, якія ствараюць вобразы ў мастацкім творы, вылучаць іх з тэксту, тлумачыць значэнне,

выяўляць іх вобразную функцыю шляхам слоўнага малявання;
- вылучаць з тэксту эмацыянальна-ацэначныя словы, словы-сінонімы, асэнсоўваць іх функцыянальнае прызначэнне: чаму гэтае слова выбраў аўтар, як яно характарызуе героя;
- падрабязна пераказваць невялікі апавядальны тэкст ці яго часткі па калектыўна складзеным плане;
- складаць тэкст на вызначаную тэму па прапанаваным плане і апорных словах з дапамогай настаўніка;
- складаць вуснае апавяданне ці казку па серыі малюнкаў або малюнку і апорных словах, па ілюстрацыі да твора;
- калектыўна ствараць творчыя пераказы (ад імя героя);
- чытаць па ролях, інсцэніраваць невялікія мастацкія творы або іх асобныя эпізоды, насычаныя дыялогамі;
- самастойна выбіраць і чытаць дзіцячыя кнігі, часопісы, газеты;
- вызначаць прыкладны змест незнаёмай кнігі па інфармацыі, змешчанай на вокладцы, тытульным лісце, у прадмове, пасляслоўі, змесце, а таксама па ілюстрацыях на вокладцы і на старонках выданняў;
- суадносіць назву і змест твора або кнігі, даваць ацэнку прачытанаму.

Асноўнымі відамі дзейнасці на ўроках літаратурнага чытання з’яўляецца чытанне ўголас і моўчкі, беглае і выразнае, выбарачнае, каменціраванае, самастойнае; завучванне вершаў на памяць; слоўнікавая праца; слуханне і пераказванне твораў; аналітычная і ацэначная работа з тэкстам твора, творчая праца ў сувязі з прачытаным; работа з дзіцячай кнігай (чытанне-разгляд дзіцячых кніг з мэтай выбару аб'екта чытання або лепшага асэнсавання прачытанага; самастойная арыенціроўка ў адной або

некалькіх кнігах па іх знешніх паказчыках; чытанне, перачытванне, пераказ зместу ўсяго твора або ўрыўкаў з яго; пастаноўка ”жывых карцін“, інсцэніроўка асобных эпізодаў, удзел у літаратурных гульнях, у арганізацыі кніжных выставак, знаёмства з бібліятэчнымі рэкамендацыйнымі паказальнікамі і інш.).

Структураваць вучэбны матэрыял пажадана па мастацка-эстэтычным, тэматычным або жанрава-тэматычным прынцыпах, каб вучні авалодалі тэматычнай лексікай, якая забяспечыць ім прадуктыўную маўленчую дзейнасць на беларускай мове, каб сфарміраваць у вучняў веды аб тэмах літаратурнай творчасці і сістэмныя ўяўленні (вобразныя) аб навакольным свеце.

Змест літаратурнай адукацыі малодшых школьнікаў рэалізуецца на ўроках літаратурнага чытання, пазакласнага чытання і факультатыўных занятках, якія забяспечваюць права школьніка на выбар заняткаў у адпаведнасці з інтарэсамі і магчымасцямі самога вучня.

Дадатак 1

## ***<u>Віды работ над тэкстам на ўроку чытання</u>***

1. Чытанне ўсяго тэксту (па заданню настаўніка).
2. Чытанне, дзяленне на часткі. Складанне плану.
3. Чытанне па гатоваму плану.
4. Чытанне, пасля чытання пераказванне.
5. Чытанне вучнем новага тэксту, раней падрыхтаванага дома.
6. Чытанне са сціскканнем тэксту. (Дзеці апускаюць сказы ці словы, якія можна не чытаць). Падрыхтоўка да сціслага пераказу.
7. Чытанне ланцужком па сказу.
8. Чытанне ланцужком па абзацу.
9. Чытанне ўпаўголаса.
10. Чытанне, знаходжанне ўрыўка да малюнка.
11. Чытанне, адказы на пытанне.

12. Знаходжанне ў тэксце ўрыўка, які дапаможа адказаць на пытанне.
13. Чытанне самага прыгожага месца ў апавяданні ці вершы.
14. Знаходжанне па дадзенаму пачатку ці канцу ўсяго сказа. (пазней сказы можна замяніць лагічна закончанымі ўрыўкамі).
15. Чытанне ўрыўка, да якога можна падабраць пасловіцу.
16. Знаходжанне сказа, з дапамогай якога можна выправіць дапушчаную памылку.
17. Знаходжанне сказа ці ўрыўка, выражаючага галоўную думку апавядання.
18. Чытанне і ўстанаўленне, што праўдзіва, а што выдумана (для казкі).
19. Чытанне, знаходжанне сказаў, якія сталі пагаворкамі (для басні).
20. Чытанне, складанне сцэнарыя да дыяфільма (коратка, падрабязна).
21. Чытанне, падборка гукавога афармлення “фільма”.
22. Гутарка з выбарчым чытаннем тэксту.
23. Знаходжанне ў тэксце 3 (5,7…) сказаў.
24. Выказванне сваіх думак аб праслуханым пасля чытання настаўнікам ці вучнем.
25. Чытанне, расказ аб тым, чым спадабаўся твор, што запомнілася.
26. Устанаўленне шляхам чытання прычынна-следчых сувязей.
27. Чытанне назвы апавядання. (Як інакш можна назваць).
28. Чытанне па асобах.

29. Чытанне па асобах дыялога, выключаючы словы аўтара.
30. Чытанне, пераказ прачытаннага з дапамогай мімікі, жэстаў, позы.
31. Знаходжанне ўрыўка, які можна прачытаць строга, весела, хмурна, з насмешкай, з нездавальненнем, радасцю.
32. Знаходжанне і чытанне сказаў з клічным, пытальным, апавядальным знакамі, коскай, шматкроп'ем.
33. Конкурснае чытанне вершаў.
34. Знаходжанне і чытанне вобразных слоў і апісанняў.
35. Знаходжанне і чытанне слоў з лагічным націскам.
36. Знаходжанне і чытанне слоў, сказаў, якія чытаюцца моцна, ціха, хутка, памалу.
37. Чытанне вершаў, растаноўка паўзаў.
38. Чытанне вершаў ланцужком, закончываючы кожны раз на паўзах.
39. Выразнае чытанне ўрыўка апавядання (верша) па асабістаму выбару.
40. Хто хутчэй знойдзе ў тэксце слова на зададзенае правіла.
41. Знаходжанне ў тэксце самага доўгага слова.
42. Знаходжанне двух-, трох-, чатырохскладовых слоў.
43. Знаходжанне ў тэксце і чытанне словазлучэнняў. (назоўнік+прыметнік; назоўнік+дзеяслоў; займеннік+дзеяслоў (можна наадварот))
44. Чытанне, паметка незразумелых слоў.

45. Знаходжанне і чытанне слоў і выразаў, з дапамогай якіх можна намаляваць вусны партрэт.
46. Знаходжанне і чытанне слоў, блізкіх па значэнню дадзеным (дадзеныя словы запісаны на дошцы)
47. Чытанне слоў, да якіх дадзены зноскі.
48. Знаходжанне і чытанне слоў і выразаў, якія можна выкарыстоўваць пры напісанні сачыненняў.
49. Чытанне з выпісаннем слоў для практычнага слоўніка (напрыклад да тэмы “Восень”, “Зіма”).
50. Камбінаванае чытанне (настаўнік – вучні хорам).
51. “Жывы малюнак” (адзін вучань чытае, другі мімікай твару рэагуе на пачутае).

## ***<u>Віды самастойнай работы з тэкстам.</u>***

1) Знайдзі ў тэксце ўрывак, які дапаможа адказаць на пытанне (можна ў канверце).
2) Прачытай самае прыгожае (цікавае) месца ў тэксце.
3) Я даю пачатак, ці канец думкі, а ў тэксце знайдзі прадаўжэнне, ці папярэднія звесткі.
4) Чытанне ўрыўка, да якога можна (патрэбна) падабраць прыказкі, прымаўкі.
5) Чытанне з вызначэннем ,што праўдзіва, а што выдумана творчасцю аўтарскай думкі (з доказамі).
6) Чытанне сказаў, якія сталі прыказкамі.
7) Скаласці падрабязны ці кароткі сцэнарый для дыяфільма.
8) Падбор гукавога афармлення дыяфільма.

9) Гутарка з суправаджэнням выбарчага чытання (можна праводзіць у групах, парах).
10) Чытанне дыялога па ролях, выключаючы словы аўтара.
11) Чытанне і пераказ прачытанага з дапамогай жэстаў, мімікі, пантамімікі.
12) “Жывы малюнак” (адзін чытае, а другі рукамі, мімікай, жэстамі паказвае сваю рэакцыю на прачытаннае).
13) Знайсці ў тэкце ўрывак, які можна суаднесці з мімікай гэтага чалавека.
14) Знайсці ў тэкце ўрывак, які можна прачытаць у групе з выражэннем розных пачуццяў, з рознымі адценнямі пачуццяў.
15) Конкурснае чытанне тэксту.
16) Выразнае чытанне тэксту па асабістаму выбару.
17) Хто хутчэй знойдзе ў тэксце словы, на зададзенае настаўнікам правіла.
18) Знайсці ў тэксце самае доўгае (кароткае) слова (словы).
19) Знайсці словы і выразы, якімі вусна можна намаляваць партрэт героя , пейзаж, падзею.
20) На дошцы запісаны словы, а ў тэксце знайсці чым больш слоў, якія блізкія ім па значэнню.
21) Знайсці ў тэксце словы, выразы, якія будуць патрэбны для будучага сачынення.
22) Знайсці і зачытаць месца ў тэксце, дзе даецца параўнальная характарыстыка герояў, падзей, параўнальнае апісанне пейзажаў.
23) Знайсці і прачытаць, якімі гукамі (гукам) перадае аўтар шэлест лістоты, удары грому.
24) Знайсці і зачытаць урывак (сказ), у якім заключана галоўная думка твора, мараль байкі.

25) Знайсці і зачытаць тую частку, якая найбольш зацікавіла цябе ў пазнавальным плане.
26) Прачытаць тую частку, якую ты змог бы напісаць па-другому, што б ты дасказаў бы, змяніў.
27) Зачытаць тэкст, раздзяліць на часткі.
28) Зачытаць частку (часткі), падабраць ім назвы, скласці план.
29) Зачытаць тэкст, падрыхтаваць пераказ па плану, сціСла, пабрабязна.
30) Прачытаць тэкст, растлумачыць значэнне запісаных на дошцы слоў і словазлучэнняў.
31) Прачытаць тэкст, падабраць яму другую назву, назваць чго прыказкай або прымаўкай.
32) Прачытаць тэкст, падрыхтавацца да інсцэніроўкі.
33) Прачытаць тэкст, дапоўніць часткі сваімі думкамі.
34) Прачытаць тэкст, параўнаць з тэкстам верша, што агульнага (рознага) выказана ў іх.
35) Прачытаць тэкст, вызначыць, даказаць, які ён па жанру.
36) Прачытаць тэкст, вызначыць, які музычны твор можа быць фонам для яго чытання.
37) Прачытаць тэкст, вызначыць, якія пачуцці ўзніклі пры яго чытанні.
38) Прачытаць тэкст, вызначыць урывак, дзе апісваецца прыгожы учынак героя.
39) Прачытаць тэкст і адказаць на пытанні: як бы я павёў сябе ў падобнай сітуацыі, што можна падсказаць герою, каб вывесці яго з гэтай сітуацыі, у якай ён аказаўся?
40) Прачытаць тэкст, зачытаць частку, якой можна апісаць ілюстрацыю.
41) Прачытаць тэкст, вызначыць сказ, якім можна падпісаць ілюстрацыю.

42) Прачытаць тэкст, паставіць пытанні па тэксту.
43) Прачытаць тэкст, прыдумаць інтэр’ю для сябра.
44) Прачытаць тэкст, вызначыць галоўную думку, тэму.
45) Прачытаць тэкст, разгледзець рэпрадукцыю карціны і падпісаць яе словамі тэксту.
46) Прачытаць тэкст, падумаць, з якой мэтай ён змешчаны ў падручніку.
47) Прачытаць тэкст, падумаць, які ўрок для жыцця ён даў чытачу.
48)Прачытаць тэкст, перакласці на рускую мову, другі (любы абзац), вызначыць, ці захаваліся асаблівасці адценняў мовы.
49) Прачытаць тэкст, вызначыць зачын і канцоўку, уступ, галоўную частку, заключэнне, кульмінацыю.
50) Прачытаць тэкст, вызначыць тэму, на якую ён напісаны і падабраць яшчэ некалькі твораў розных аўтараў на гэтую ж тэму.
51) Прачытаць тэкст, вызначыць, якія выразы з гэтага тэксту сталі ўстойлівымі словазлучэннямі, фразеалагізмамі.
52) Прачытаць тэкст, намаляваць ілюстрацыю да найбольш цікавай часткі для цябе.
53) Прачытаць тэкст, прыдумаць, якія словы можна змяніць блізкімі па значэнню словамі, каб захаваўся сэнс і галоўная думка твора.
54) Прачытаць тэкст, вызначыць, як мага больш слоў, якія абазначаюць прымету прадметаў (дзеянне прадметаў).
55) Прачытаць тэкст, падрыхтавацца выразна пераказаць яго, правільна перадаць інтанацыю пабуджальных сказаў.
56) Прачытаць тэкст, параўнаць апісанне пейзажу ў творы з тым, што бачым за акном школы.

57) Прачытаць тэкст, падумаць, якія выраз, сказы табе хацелася б ужываць у сваёй мове, у гутарцы з сябрамі.
58) Прачытаць тэкст, падумаць, якую яшчэ частку ты з цікавасцю расказаў бы маме з татам, якую – сябру, а якую незнаёмаму чалавеку.
59) Прачытаць тэкст, падумаць, якія кнігі (творы) на гэтую ж тэму вы ўжо чыталі.
60) Прачытаць тэкст, самастойна дома падабраць творы на такую ж тэму (можно аднаго, можна розных аўтараў).
61) Прачытаць тэкст казкі, вызначыць, што з таго, што было калісьці небыліцай, стала ў наш час быллю.
62) Прачытаць тэкст, вызначыць, якую праблему вырашае аўтар у сваім творы.
63) Прачытаць тэкст, вызначыць, у якіх яшчэ творах героі паводзілі сябе так, як герой гэтага твора.
64) Прачытаць тэкст, узнавіць дэфармаваны план яго пераказу.
65) Прачытаць тэкст, суаднесці яго з серыяй малюнкаў, скласці карцінны план.
66)Прачытаць тэкст, замяніць пытальныя сказы плана апавядальнымі, пабуджальнымі.
67) Прачытаць тэкст, раздзяліць на часткі, назваўшы часткі сказамі з тэксту.
68) Прачытаць тэкст, вызначыць каго з герояў ты бы ўзяў бы ў дружбакі. (Свой вывад абгрунтаваць).
69) Прачытаць тэкст, вызначыць, хто з герояў гэтага твора будзе вечна цікавым дзіцячаму чытачу.
70) Скласці па прачытанаму тэксту слоўны фотаробат героя.
71) Прачытаць тэкст, даць характарыстыку героя, выказаўшы свае адносіны да яго.

## ЗАДАННІ ПА ЛІТАРАТУРНАМУ ЧЫТАННЮ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ З ВЫСОКІМ УЗРОЎНЕМ

1. Намалюйце любімага героя, складзі спіс слоў для яго апісання.
2. Апішы месца дзеяння, намалюй ілюстрацыю.
3. Прыдумай рэкламу.
4. Параўнай сябе з адным з герoеў кнігі.
5. Падбяры прыказкі, загадкі да прачытанага.
6. Пастаў 1-4 пытанні да прачытанага.
7. Знайдзі ўрывак, які выражае галоўную думку, ідэю твора.
8. Выпішы з тэкста 2-4 слова на вывучаныя арфаграмы.
9. Запішы кароткія звесткі аб творчасці пісьменніка, падрыхтуй апавяданне аб ім.
10. Паспрабуй скласці арыфметычныя задачы, выкарыстоўваючы змест прачытаннага твора.
11. Напішы пісьмо да аўтара ці героя твора.

12. Напішы сінквейн.
13. Падзялі тэкст на часткі, складзі план.
14. Падрыхтуй сціслы або творчы пераказ тэкста.
15. Знайдзі сказ , які трэба прачытаць вось так.

**Прыёмы работы над тэкстам**

1. Чытанне - сачэнне (адзін чытае, астатнія правяраюць).
2. Чытанне – разведка (знайсці самые галоўные радкі).
3. Чытанне – маланка – гудзенне, чытанне як умее, чытанне пад стук – зноў гудзенне – зноў як скорагаворку.
4. Чытанне – рэле: пачынае чытаць увесь клас – гучней-гучней-цішэй-цішэй.
5. Харавы – суфлёр: адзін вучань чытае ў дошкі, калі вучань робіць памылку, увесь клас хорам выпраўляе.
6. Паліфанічнае чытанне: чытанне на памяць верша некалькімі вучнямі (адзін чытае, другі прадаўжае).
7. Чытанне пад музыку.
8. Чытанне “пеўнямі” ( паглядзеў радок – расказаў яго па памяці).
9. Чытанне – эха (выдзяляюць лагічным націскам галоўнае слова) чытанне за настаўнікам.

10. Чытанне з лінейкай (закрываць тэкст, хуткасць чытання, адпрацоўка).
11. Чытанне ў ролі дыктара (вучань сядае за каробку (тэлевізар), астатнія дзеці закрываюць вочы і слухаюць, яны павінны ўявіць пачутае.
12. Чытанне хваляй: ланцужком кожны.
13. Чытанне па ролях.
14. Чытанне-буксір: спачатку чытаюць тыя, хто чытае добра, потым тыя, хто горш, затым зусім дрэнна.
15. Чытанне-спрынт: на карацешыя дыстанцыі хто хутчэй.
16. Чытанне-моўчкі: хто першы прачытае падымае руку, яму задаюцца пытанні.
17. Чытанне з палоскай.
18. Жужжачае чытанне: каб усе чыталі.
19. Чытанне ў парах: перш, чым адказаць на пытанне прачытаць адзін аднаму.
20. Чытанне пра сябе.
21. Гульня ў хованкі: замяніць пры чытанні слова сінонімам.
22. Уяўнае слова – я чытаю і якое слова замяняю, дзеці павінны заўважыць.
23. Выбарачнае чытанне.
24. Пяціхвілінная чытанне.
25. Кантрольнае чытанне.

Дадатак 2

**Як падрыхтаваць падрабязны пераказ**

1. Перачытаць тэкст. Запомніць яго паслядоўнасць.
2. Выдзеліць асноўныя часткі тэксту.

3. Вызначыць у кожнай частк\u0456 галоўнае.
4. Скласц\u0456 план (загаловак пав\u0456нен адпавядаць асноўнаму зместу частк\u0456), зап\u0456саць яго.
5. Перачытаць увесь тэкст паводле пунктаў плана.
6. Пераказаць кожную частку плану.
7. Прыверыць сябе: закрыць кн\u0456гу \u0456 пераказаць тэкст па плану.

## Як скласц\u0456 план тэксту

1. Прачытаць усё апавяданне. Звярнуць увагу на тое, як яно пабудавана: аб чым гаворыцца ў пачатку, як\u0456я падзе\u0456 ап\u0456саны пасля, чым заканчваецца тэкст.
2. Падзял\u0456ць тэкст на частк\u0456 (адна частка адрозн\u0456ваецца ад другой новым зместам).
3. Перачытаць першую частку. Выдзел\u0456ць ў ёй сказы, у як\u0456х выражана галоўная думка (адзначыць \u0456х “птушкай”).
4. Даць загаловак гэтай частцы. Зап\u0456саць свой загаловак.
5. Тую ж работу (п. 3, 4) правесц\u0456 па друг\u0456х частках. Праверыць сябе па кн\u0456зе: ц\u0456 адпавядае загаловак галоўнай думцы, ц\u0456 не прапушчана галоўнае.

## Як “намаляваць карцінку” словамі

1. Перачытаць тэкст або яго ўрывак, які адносіцца да карцінкі.
2. Вызначыць, аб чым гэта карцінка.
3. Вызначыць, што будзе “намалявана”.
4. Знайсці ў тэксце словы, якія дапамогуць выканаць заданне. Падкрэсліць іх.
5. Уявіць сабе карцінку ў думках.
6. Прагледзіць тэкст і праверыць сябе: ці адпавядае карцінка тэксту.
7. “Намаляваць” яе словамі.

## Як адказваць на пытанні

1. Прачытаць тэкст, пытанні і заданні да тэксту (каб ведаць іх загаловак і чытаць тэкст мэтанакіравана).
2. Прачытаць тэкст. Заўважаць у ім месцы, неабходныя для адказу на пытанні.
3. Яшчэ раз прачытаць тэкст і знайсці адказ на кожнае пытанне (адзначыць “птушкай”).
4. Пракантраляваць сябе: закрыць кнігу і адказаць “сам сабе” на ўсе пытанні.

## Творчыя заданні

1. Намаляваць любімага героя, скласці спіс слоў для яго апісання.
2. Скласці рэкламу.
3. Апісаць месца дзеяння, намаляваць ілюстрацыю.
4. Параўнаць сябе з любімым героем кнігі.
5. Падабраць прыказкі, загадкі да прачытанага.
6. Паставіць 2-4 пытанні да прачытанага.
7. Знайсці ўрывак, які выражае галоўную думку, ідэю твора.
8. Выпісаць 2-4 слова на вывучаныя арфаграмы.
9. Запісаць кароткія звесткі пра пісьменніка, падрыхтаваць апавяданне аб ім.
10. Скласці арыфметычную задачу, выкарыстоўваючы змест прачытанага.
11. Напісаць пісьмо да аўтара ці героя твора.
12. Напісаць сінквейн.
13. Падзяліць тэкст на часткі, скласці план.
14. Падрыхтаваць сціслы або творчы пераказ тэкста.
15. Знайсці сказ, які трэба прачытаць:

а) добразычліва;
б) сумна;
в) шчасліва;
г) раз'юшана;
д) незадаволена;
ж) спалохана;
з) задумліва.

**Аналіз прачытанага апавядання**

1) Перадтэкставы этап работы дазваляе эмацыянальна настроіць вучняў на ўспрыманне твора.
2) Першаснае чытане твора (чым настаўнік выразней прачытае твор, тым лепш ён данясе да свядомасці вучняў яго змест, вобразы, ідэю, тым больш гэты твор будзе ўплываць на пачуцці дзяцей, выклікаць ў іх пэўныя эмоцыі).
3) Кароткая гутарка з мэтай праверкі. Якія пачуцці выклікаў у вас твор, як зразумелі ідэйную задуму пісьменніка. У час гэтай гутаркі ставіцца 2-3 пытанні: Хто галоўны герой твора? Чым спадабаўся?..

Слоўнікавая работа – гэты від работы дае магчымасць патлумачыць вучням значэнні незразумелых ці малаўжывальных слоў:

- падбор сінонімаў;
- падбор антонімаў;
- разгорнутае апісанне па слоўніку;
- падвядзенне слова пад родавідавую прымету;
- словаўтваральны аналіз;
- увядзенне слова ў кантэкст.

4) Другаснае чытанне тэксту вучнямі з мэтай лепшага ўсведамлення зместу твора.
5) Аналіз твора: звяртаецца ўвага на змест твора, матывуюцца ўчынкі паводзіны галоўных герояў, звятаецца ўвага на тэму і ідэю твора.
6) Падзел тэксту на часткі, складанне плана.
7) Выпрацоўка выразнасці чытання.
8) Пераказ ці інсцэніроўка.
9) Абагульняючая гутарка.
10) Дамашняе заданне.

## Паслядоўнасць работы над казкай

1) Расказванне казкі настаўнікам з захаваннем эмацыянальнасці мовы, дынамічнасці характару персанажаў і гумарыстычнай афарбаванасці некаторых эпізодаў.
2) Гутарка э мэтай праверкі першага ўспрымання твора. Слоўнікавая работа.
3) Чытанне казкі вучнямі па частках  і разбор кожнай часткі (дапаможа ім лепш зразумець змест і разабрацца ў кампазіцыі і мове казкі)
4) Чытанне казкі сам сабе з заданнем падрыхтавацца да вуснага малявання.
5) Абагульняючая гутарка, якая падрыхтуе вучняў да расказвання казкі, дапаможа ім зрабіць вывад.
6) Чытанне казкі па ролях. Кожны вучань прадумвае сваю роль, асэнсоўвае асаблівасці мовы кожнага персанажа.
7) Складанне плана з дапамогай настаўніка, падбор загалоўкаў і падрыхтоўка да расказвання казкі.
8) Расказванне казкі вучнямі.

## Паслядоўнасць работы над байкай

1) Падрыхтоўчая гутарка (расказ настаўнікам пра аўтара байкі; гутарка пра жывёл – дзеючых асоб байкі).
2) Першаснае чытанне байкі настаўнікам.
3) Карокая гутарка эмацыянальна-ацэначнага плана.
4) Другаснае чатанне байкі вучнямі.
5) Аналіз зместу. Звяртаецца ўвага:
   - на змест-кампазіцыю;
   - сітуацыю, у якой дзейнічаюць героі;
   - на мову персанажаў;
   - на характэрныя рысы персанажаў.
6) Раскрыццё алегорыі (каго або што асуждае аўтар ў байцы. Чаму? Як зразумелі сэнс апошніх радкоў байкі?).
7) Падрыхтоўка да выразнага чытання.
8) Выразнае чытанне вучнямі.

**Паслядоўнасць работы над вершам**

1) Падрыхтоўчая гутарка (музыка, малюнак, выкарыстаць дзіцячыя ўражанні, расказ пра пісьменніка).
2) Чытанне верша.
3) Праверка першага ўспрымання верша (які настрой выклікаў верш? Якія пачуцці выказаў паэт ў вершы?).
4) Раскладанне маляўнічага вобраза на часткі. (Якімі вы ўяўляеце рэчку, поле, дрэвы, кусты зімою?).

5) Другаснае чытанне верша. (Вучні чатыюць радкі з верша, у якіх апісаны адзін з малюнкаў і расказваюць, што яны ўявілі?)
6) Аналіз. Звяртаецца ўвага на:
- настрой, пачуцці;
- мастацкія сродкі;
- асобу аўтара.
7) Заключнае слова настаўніка.

Дадатак №3

**Развіваць мову дапамагае гульня**

_Дапоўні слова_
Вядучы называе частку слова (гу…) і кідае вучню мяч. Той павінен злавіць яго і дапоўніць слова (…кі).

_Хто лепей і хутчэй_
Трэба прыдумаць апавяданне, у якім словы пачыналіся б з адной літары. Гэтае заданне лепш выконваць па групах. Чытаць жа апавяданне могуць альбо адзін вучань, альбо па чарзе ўсе ўдзельнікі групы.

_Прыдумай сам_
Дзецям неабходна прыдумаць з двух, трох, чатырох, пяці слоў уяго шэсць сказаў. Ацэньваецца логіка апавядання і выразнасць яго перадачы.

_Пакліч шчаня_
Дзеці павінны па-рознаму (строга, ласкава, сярдзіта, гучна, ціха) паклікаць шчаня.

*Скажы правільна*

Дзеці павінны сказаць фразы, паслядоўна змяняючы сэнсавы націск (пр.: Іваноў самы лепшы матэматык у класе).

*У каго самая вялікая сям'я?*

Да слова **дом** (любыя словы з чыстай асновай) падсяліць сваякоў (аднакарэнныя словы). Чыя сям'я будзе большай, той пераможца. Набходна сачыць, каб сям'ю не папалі "чужыя" словы.

*Цягнік*

У цягніку 2 вагоны. У першым жывуць адушаўлённыя назоўнікі, а ў другім - неадушаўлённыя. Неабходна пасадзіць словы ў вагоны. (Можна прапанаваць размеркаваць часціны мовы (назоўнікі, прыметнікі, дзеясłоў) па вагонах).

*Лічы, ды не памыліся*

Колькі літар і гукаў у пэўных словах.

*Закончы сказы*

Хлопчык іграў на … ( баяне, балалайцы).
Дзеці пасадзілі …(бярозу, бульбу).
Век жыві, век … (вучыся).
Добра таго вучыць, хто ўсё хоча…(ведаць).
Слова як птушка: выпусціў – не … (вернеш).
Над намі праляталі…( гусі, галкі , гракі).
Тата паехаў у …(горад).
Дзеці са смакам елі…(дыню).
Кожны дзень я на машыне … (езджу).

На раку  і з ракі па сцяжынцы я …(хаджу).
Пачынаўся ясны, пагожы …(дзень).
Унукі падзякавалі … (дзеду).
На рэчцы трашчаў … (лёд).
У заапарк прывезлі … (жырафу, зебру, тыгра, аленя).
Ля сажалкі квакалі … (жабы).
Ад ваўкоў уцякаў … (заяц).
На ўсходзе ружавела …(зара).
Сабака гаўкае, а конь …(іржэ).
Спявак спявае, баяніст…(іграе).
Восенню птушкі адлятаюць у … ( вырай).
Сцюжы бываюць … (зімой).
Повара на караблі называюць … (кок).
Наступіла цёплае , сонечнае …(лета).
Карова дае … (малако).
Ліса схавалася ў … (нару).
На стадыёне гулялі вядомыя … (футбалісты).
У кінатэатры на ўсю сцяну вісеў белы …(экран).
Мы выпісваем газеты і … (часопісы).
Рыбак злавіў вяліага … (шчупака, акуня, карпа).
Над возерам кружылася … (чайка).
Нам газеты прнёс … (паштальён).
На плоце пракукарэкаў … (певень).
Дзяўчынка прачнулася … (рана, позна).
Тамара падарыла кнігу … (Толю).
Тата купіў сыну цікавую … (цацку, кніжку).

**Літаратурныя гульні да ўрока па творчасці**
**М. Чарняўскага**

***Віктарын “Адгадай!”***

*Паводле вершаў М. Чарняўскага з кнігі “Залатая ніва”*
Згадайцеся, што расце ў полі (ад “А” да “Я”).

1. – Хрумстайце, коні,
Каб бегаць шпарчэй!
Дзеці,
Смакуйце суп!
А да аладак пшанічных яшчэ
І кісялю прынясу.
**(Авёс)**

2. Ад палеткаў, ад загонаў
Ранняй восенню штодзень
І ў трохтонках, і ў вагонах
Яна едзе да людзей.
Што б ні еў –
Прыесца з часам.
Яна ж нашая – ніяк!
Кожны з нас
Да яе ласы,
Без яе
Нішто не ўсмак.
**(Бульба)**

3. Нас ён корміць
Шмат вякоў,
Суп з яго –
Ох, смачны!
А струкі?
З’ясі струкоў –
Будзеш
Тройчы ўдзячны!

**(Гарох)**

4. Ах, як пахне яна мёдам!
Што не верыш, дружа?
Як цвіце –
Над ёй заўсёды
Пчолы роем кружаць.
Пчолы тут бяруць нектар –
Вельмі шчодры яе дар!
**(Грэчка)**

5. “Я культура хлебная,
Я – усім патрэбная!
Крупы я, і маргарын,
І мука, і жэлацін.
Я віскоза, і крахмал,
І усялякі матэрыял…”
А дзятве і катахі –
Пачастунак неблагі!
Наламаць, напарыць іх –
Будзеш есці за траіх!
**(Кукуруза)**

6. Зацвіце – блакіту болей.
Пчолкам рупным весялей.
І над нівою,
Над полем
Сінява – яшчэ сіней!
“Мы цябе так апрацуем –
Будзе люба паглядзець.
Ты расці, расці на славу,
Сінявокі маладзец!”

**(Лён)**

7. Цячэ струмень-
Не надзівіцца!
Струмень здаецца
Залатым.
Як быццам нейкая
Царыца
У кроплях сонца ці бурштын.
**(Пшаніца)**

8. Вусач-рагач -
Пшаніцы брат,
Што ён скупы,
Ніхто не скажа:
І смачны хлеб
З яго зярнят,
І крупнік добры нам,
І каша.
**(Ячмень)**

## Прыказкі і прымаўкі

Адна ластаўка вясны не робіць.
Адна галава добра, а дзве лепей.
Бацькоў слухаць – гора не знаць.
Бацька з маці не рабоце не томяцца, калі з дзетак сваіх цешацца.
Веды даражэй за золата.
Век жыві – век вучыся.
Дзе гультай ходзіць, там зямля родзіць.

Гультаяю хоць тры дні не есці, абы з печы не злесці.
Дрэва славіцца пладамі, а чалавек – рукамі.
Добрае чуваць далёка, а благое яшчэ далей.
З малых крыніц вялікая рака нараджаецца.
Хто за Радзіму гарой, той сапраўны герой.
Ідзі з людзьмі, то не згубішся.
Дзе праца там і песня.
Адна пчала мёду не ночіць.
Шчырая праца – мазалёвая.
Жыццё пражыць – не поле перайсці.
За вялікім пагонішся – малое згубіш.
Згубленнае золата можна знайсці, згубленны час – ніколі.
Ідзі ў родны край, там і пад елкаю рай.
Кожнаму свой куток мілы.
Красавік з вадою, май з травою.
Лепш недагаварыць, чым перагаварыць.
Людзей слухай, а свій розум май.
Мурашка невялікая, горы капае.
Менш гавары – больш рабі.
Не сілай бяры, а розумам.
Навука для чалавека, як сонца для жыцця.
Ад добрага кораня і добры сучок.
У чужой старонцы не так свеціць і сонца.
Праца чалавека корміць, а лянота псуе.
Пад ляжачы камень вада не цячэ.
Родная зямля – маці, чужая старонка – мачыха.
Розум і сілу перамагае.
Розуму за грошы не купіш.
Слова не верабей: выпусціш – не зловіш.
Слухаць добрай рады не шкодзіць.
Той шчаслівы, хто працалюбівы.
Тое дорага, што нялёгка даецца.

У дзіравым вядры ваду не носяць.
У сваім краі, як у раі.
Баязліўцу адзін пень за тры ваўкі здаецца.
Ваўкоў баяцца – у лес не хадзіць.
Фарсун такі, што і носа не дастаць.
Факты - рэчы упартыя.
Хто доўга спіць, то хлеба не бачыць.
Хочаш быць шчаслівым – не будзь лянівым.
Цішэй едзеш – далей будзеш.
Чуў звон, ды не ведве, дзе ён.
Чорнае белым не стане.
Шылаў мяшку не схаваеш.
Шчыраму сэрцу і чужая болька баліць.
Жыві сваім розумам, а не чужым.
Навука вочы адкрывае.
Адзін раз зманш – другі не паверыць.
Праўду і ў полымі не спаліш, і ў вадзе не ўтапіць.
Чалавек без сябра, што дрэв без карнёў.
Чым цяжэй, тым даражэй.
Не плюй у крыніцу: прыйдзеш па вадзіцу.
Любіш катацца, любі і саначкі вазіць.
Які салавей, такая і песня.
Як прывітаешся, так і адкажуць.
Напалоханая варона і вераб’я баіцца.

## Скарагаворкі

1. Звала па маліну
Марына Галіну
Галіна Марыну
Звала па маліну.

2. Мама Мілу мыла мылам,
Міла мыла не любіла.

3. Ці маліну мылі вы ?
Мылі , да не мылілі.

4. Тчэ ткач тканіну на хустачку Яніне.

5. Тра–та–та, тра-та-та ,
Кошка выйшла за ката,
За ката Катовіча,
За Пятра Пятровіча.

6. У мухі няма вуха
Няма вуха ў мухі.

7. Пайшла каза ў арэхі,
Нашчыпала тры мяхі,
А чацвёрты – шалухі.

8. Шылам мушка мыла вушка.

9. Шэсць мышанят у шалашы шамацяць.

10. Сашы далі кашы, а Машы сыраквашы.

11. Сарока вірліва стракоча,
Сказаць штосьці слушнае хоча.

12. Сонейка стамілася, за лес пакацілся.

13. У Ларысы і Валеры
На ліпе арэлі.

14. У двары нара, пад гарой нара.

15. Як Якімка, так і Хімка,
А як Хімка, так і Якімка.

16. Спрытна кроп палоў Пракоп,
Лёг пад кропам і захроп.

17. Вадавоз вёз ваду ад вадаправода .

18. Звонка – звоніць званок, звініць заліваецца.

19. Белы бусел баіў байку беламу зайку.

20. Улавілі кобру, пасадзілі ў торбу.
Калі ў торбе кобра – гэта вельмі добра.

21. Дудар дудару дарма грае.

22. Горкай, горкай, горачкай
Ішоў малы Ягорачка,
Пратаптаў Ягорачка
Сцежачку да горачкі.

23. У чаплі чапляня, у зайкі зайчаня.

24. Стаіць воз аўса, каля воза аўца.

25. Кураняты і курыца п’юць чай на вуліцы.

26. Дзятлы дзюбамі дзяўблі дрэва.

27. Бегаў сева вакол дрэва,
Потым дрэва вакол Севы.

Дадатак 4

**Тэма: Смех лечыць чалавека. Васіль Ткачоў “Задачка”. 3 клас**

**Мэта:**
- фарміраваць навык моўнага этыкету, уменне будаваць дыялагічную мову;
- выхоўваць маральныя якасці асобы, павагу да блізкіх, добразычлівасць, самастойнасць;
-адпрацоўваць навык выразнага чытання, развіваць мову, увагу, садзейнічаць уменню вобразна мысліць

**Абсталяванне:** падручнік “Буслянка” 2 кл., метадычныя дапаможнікі, крыжаванка, запісы на дошцы.

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны пачатак**

- Вы вельмі разумныя і кемлівыя, спадзяюся, што вы будзеце добра працаваць на ўроку, добразычліва адносіцца адзін да аднаго. Паглядзіце адзін на аднаго, вазьміцеся за рукі, усміхніцеся, пажадайце добрага настрою і плённай працы.

**2. Развіццё мовы**

- Як ускрыкваюць ад болю? (Ой! Ай! )
Ой-ой-ой, ой-ой-ой—чэрці гоняцца за мной.
Ай-ай-ай, ай-ай-ай – хоць хто-небудзь выручай!
Эй-эй-эй, эй-эй-эй – хто паможа мне хутчэй?
Ёй-ёй-ёй, ёй-ёй-ёй – я са стрэльбаю сваёй.
Яй-яй-яй, яй-яй-яй – стой, Міхаська, не страляй!
Ей-ей-ей, ей-ей-ей – то куст лазы. Няма чарцей.

**3. Праверка дамашняга задання**

- Які твор чыталі дома?
- Хто яго аўтар?
- Пра які месяц і дрэва ідзе гутарка ў тэксце?
- Чаму вучыць нас гэты твор? (Моц і сіла перамагаюць стыхію прыроды.)
* Праверка выразнага чытання твора.
* Вызначэнне лепшага чытача ў класе.
* Падвядзенне вынікаў праверкі дамашняга задання.

**4. Паведамленне тэмы і задач урока**

- Як вы разумееце выраз: “Смех лечыць чалавека”?
- А ці любіце вы смяяцца?
- Раскажыце, як вы смешыце адзін аднаго, сваіх бацькоў?

- А ці даводзілася вам калі-небудзь хлусіць каму-небудзь? Раскажыце.
- Знаёмлю з апавяданнем урока “Задачка”.
- А што такое сцэнка?

**5. Чытанне твора настаўнікам.**

- Чаму аўтар назваў свой твор “Задачка”?

**6. Слоўнікавая работа**

* Заўзяты балельшчык
* Натоўп – гурт людзей.
* Ганарлівец – чалавек перакананы ў сваёй вартасці, годнасці; горды, фанабэрысты, самаўпэўнены.

**7. Чытанне твора вучнямі**

1.Самастойнае чытанне тэкста.
2.Чытанне “ланцужком” па адным сказе.
3. “Скачкі”. Чытанне тэксту праз слова.
- Дзе адбываецца дзеянне?

**8. Фізхвілінка** (імітацыя рухаў)
Мы крышачку стаміліся,
А потым весяліліся,
Угору пацягнуліся,

Сонцу ўсміхнуліся,
Промні засвяціліся,
Ручкі апусціліся.

**9.Аналіз твора**

- Куды прыбег Міша перад пачаткам заняткаў?
- Што ён прасіў у сяброў?
- Хто з дзяцей рашыў задачу і сказаў аб гэтым?
- Як адказаў Міша, калі ў яго запыталі чаму ён не рашыў задачку?
- Як пачаў апраўдвацца Міша? Якую адгаворку ён прыдумаў?
- Ці паверылі яму аднакласнікі? Чаму?
- Хто з дзяцей змог растлумачыць, чаму Міша не рашыў задачку?
- Чым займаўся Міша замест таго, каб рыхтаваць дамашняе заданне?
- Пра якую рысу характара гаворыць гэты пастулак?
- Як назваў Алік Мішу?
- Чаму аднакласнікі смяяліся, а Мішу было не да смеху?
- Ці змаглі б вы зрабіць так, як Міша?

**10. Работа з малюнкам да твора**

- Разгледзьце ўважліва малюнак да твора на ст. 118 і падбярыце да яго словы з тэкста.
- Якія малюнкі намалявалі б вы да гэтага твора?

**11. Чытанне тэкста па асобах і яго інсцэніроўка.**

**12. Разгадванне крыжаванкі**

- Адкажыце на пытанні крыжаванкі словамі з тэксту.
1. Што не рашыў Міша? (задачу)
2. Што ён менавіта не зрабіў з задачай? (не рашыў)
3. Што ён нават не ведаў? (умовы)
4. Хто з дзяцей змог растлумачыць, чаму Міша на рашыў задачкі? (Алік)
5. Што быццам бы балела Мішы? (галава)
6. Як Алік назваў Мішу? (ганарлівец)
7. За якую каманду гуляў Міша? Як яна называлася? ("Ракета")
8. Хто з дзяцей рашыў задачку і сказаў аб гэтым? (Каця)

*9.*

*1.* з **а** д а ч к а
*2.* н е р а **ш** ы ў
*3.* **у** м о в а
*4.* а л і **к**
*5.* г **а** л а в а
*6.* г а **н** а р л і в е ц
*7.* р а к **е** т а
*8.* к а **ц** я

- Прачытайце слова, якое атрымалася па вертыкалі пад № 9. (Ашуканец)

**13. Дамашняе заданне**

Навучыцца інсцэніраваць апавяданне "Задачка", с. 117-119.

**14. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія.**

- Ці спадабаўся вам Міша?
- Ці хацелі б вы быць падобнымі на яго?
- Выкажыце свае ўражанні наконт прачытанага твора.
- Надышоў часпадвесці вынікі нашага ўрока. Як вам працавалася? Не стаміліся? Дзякуй за працу!

## ***Заключэнне***

*Вядома, што ад першых гадоў жыцця ў многім залежыць тое, якім вырасце дзіця, як складзецца яго лёс. "Менавіта ў маленстве, - зазначае выдатны беларускі дзіцячы пісьменнік, педагог Васіль Вітка, - ствараецца залаты запас усяго жыцця чалавека, закладаюцца асновы яго душэўнага хараства". У працэсе фарміравання будучай асобы важная роля належыць літаратуры. Кніга для малых – гэта першы настаўнік і друг. Яна ўзбагачае іх мову, знаёміць з навакольным светам, выхоўвае любоў да роднага слова, роднай прыроды, да працы, да ўсяго ўзвышанага і прыгожага*.

## **Л і т а р а т у р а**


1. Н.С. Губарэвіч. Кніга – акно ў свет. –ПШ, 2005, №4
2. Ю.Б. Зотаў. Арганізацыя сучаснага ўрока
3. І.М. Грышкова. Літаратурныя гульні. – ПШ, 2008, №1
4. Вучэбныя праграммы І- Іv класаў, 2011.

Уводзіны…………………………………………………………………..
3

**Змест**

Уводзіны…………………………………………………………………..
3

Чытанне –важнейшы сродак пазнання............................................4
Дадатак 1. Віды работы з тэкстам………………………………9
Дадатак 2. Памяткі………………………………………………17
Дадатак 3. Літаратурныя гульні…………………………………22
Дадатак 4. Урок па літаратурнаму чытанню……………………31
Заключэнне …………………………………………………………..35

Вучэбна – метадычнае выданне

# Разнастайныя формы і метады работы з тэкстам - умова фарміравання навыка чытання

Адказны за выпуск Т.М. Ганчар
Камп'ютарны набор і вёрстка Т.М. Ганчар
Папера пісчая. Фармат 60х84/16

231931, Гродзенская вобласць, Зэльвенскі раён,  в.Каралін,
тэл. (8-01564) 41-2-38

***Для заўваг***